ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*
## *HISTORY*

УДК 903'12«633»(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-103-111

Паступіў у рэдакцыю 21.02.2025
Received 21.02.2025

**А. М. Вашанаў**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ГІСТОРЫЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ПОМНІКАЎ КУДЛАЕЎСКАЙ КУЛЬТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Аннотация.** В статье освещаются вопросы, связанные с развитием научных взглядов на мезолитическую кудлаевскую культуру. В истории изучения памятников кудлаевской культуры на территории Беларуси можно выделить четыре этапа, каждый из которых характеризуется состоянием исследований, а также отображает разные научные подходы к изучаемой проблематике: первый этап – от 1870-х до середины 1920-х гг.; второй этап – от середины 1920-х до начала 1960-х гг.; третий этап – от начала 1960-х до середины 1990-х гг.; четвёртый этап – со второй половины 1990-х гг. и продолжается по сей день.

**Ключевые слова:** мезолит, микролиты, кудлаевская культура, типология, кремень, хронология, ареал

**Для цитирования:** Вашанаў, А. М. Гісторыя даследавання помнікаў кудлаеўскай культуры на тэрыторыі Беларусі / А. М. Вашанаў // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2025. – Т. 70, № 2. – С. 103–111. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-103-111

**Aliaksandr M. Vashanau**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## HISTORY OF RESEARCH OF THE SITES OF KUDLAIVKA CULTURE ON THE TERRITORY OF BELARUS

**Abstract.** The article considers issues related to the development of scientific views on the Mesolithic Kudlaivka culture. In the history of the study of the sites of Kudlaivka culture on the territory of Belarus, four stages can be distinguished, each of which characterizes the state of research, and reflects different scientific approaches to the studied issues. The first stage: 1870s – to the mid – 1920s; the second stage: from the mid – 1920s to the early 1960s; the third stage: from the early 1960s to the mid – 1990s; the fourth stage: from the second part of 1990s and continues to the present day.

**Keywords:** mesolithic, microlithic, Kudlaivka culture, typology, flint, chronology, area

**For citation:** Vashanau A. M. History of research of the sites of Kudlaivka culture on the territory of Belarus. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2025, vol. 70, no. 2, pp. 103–111 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-103-111

**Уводзіны.** Упершыню меркаванне аб наяўнасці на ўсход ад р. Заходні Буг помнікаў эпохі мезаліту са своеасаблівым крамянёвым інвентаром было выказана польскім археолагам С. К. Казлоўскім у другой палове 1960-х гг. [1, s. 12–16]. Даследчык адзначыў пэўную ступень падабенства ў матэрыялах каморніцкай культуры на тэрыторыі Польшчы і шэрагу стаянак Украінскага Палесся. Высновы С. К. Казлоўскага грунтаваліся на аналізе матэрыялаў 1920–1930-х гг. [2]. Пашырэнне крыніцазнаўчай базы і ўвядзенне ў навуковы ўжытак матэрыялаў калекцый, атрыманых у міжваенны перыяд (Кажан-Гарадок, Кудлаеўка і інш.), дазволілі С. К. Казлоўскаму абгрунтаваць ідэю аб своеасаблівасці помнікаў, распаўсюджаных у басейне рэк Прыпяць, Сож і ніжняй Дзясны. Вынікам гэтага стала вылучэнне новай культурнай адзінкі, якая атрымала назву *«комплексы тыпу Кудлаеўка»* [3, s. 84–86].

© Вашанаў А. М., 2025

Далейшыя захады, звязаныя з развіццём канцэпцыі новай культурнай адзінкі, былі зроблены ў другой палове 1970 – сярэдзіне 1980-х гг. украінскім даследчыкам Л. Л. Залізняком. Ён пашырыў крыніцазнаўчую базу новага таксона і ўключыў у яго арэал тэрыторыю Паўночна-Усходняй Украіны і Паўднёва-Усходняй Беларусі. Грунтуючыся на працах сваіх папярэднікаў, а таксама на падставе ўласных даследаванняў, Л. Л. Залізняк увёў новую назву – *«помнікі тыпу Тацэнкі-Кудлаеўка»* [4], а пасля вылучыў асобную *тацэнкі-кудлаеўскую культуру* [5].

У 1989 г. выйшла манаграфія С. К. Казлоўскага, прысвечаная мезаліту Польшчы, у якой даследчык увёў у навуковы ўжытак канчатковую назву таксанамічнай адзінкі – *кудлаеўская культура* (далей – КДК) [6, s. 173–176].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца асвятленне гісторыі вывучэння помнікаў з матэрыяламі КДК на тэрыторыі Беларусі. Упершыню робіцца спроба сістэматызацыі вынікаў шматгадовай працы беларускіх археолагаў з вылучэннем асобных этапаў у гісторыі вывучэння помнікаў КДК.

**Асноўная частка.** Першыя помнікі з матэрыяламі, якія зараз атаясамліваюцца з КДК у Беларусі, былі выяўлены яшчэ ў апошняй трэці XIX ст. [7, s. 98–99; 8, c. 443; 9]. Аднак аб'ектам мэтанакіраванага вывучэння яны сталі толькі ў другой палове 1980-х гг., а да гэтага часу разглядаліся ў кантэксце іншых археалагічных культур.

Падчас разведак па р. Нёман у 1872 г. З. Глогер сабраў крамянёвыя матэрыялы каля в. Пышкі (Гродзенскі р-н, Гродзенская вобл.) [7, s. 98–99]. Атрыманая калекцыя налічвала больш за 130 крамянёвых вырабаў[1], сярод якіх прысутнічалі трапецыі высокіх формаў [11, s. 50–51]. М. Ф. Беляшэўскі ў 1889 г. абследаваў помнік каля в. Раманавічы (Гомельскі р-н, Гомельская вобл.), дзе сярод выяўленых крэменяў з апрацоўкай былі знойдзены ў тым ліку «некалькі вастрыёў з падпраўленымі краямі» [8, c. 443]. Е. Р. Раманаў паўторна наведаў гэты помнік у 1897 г., адзначыўшы вялікую колькасць зафіксаваных тут артэфактаў, і аднёс яго да тыпу «майстэрняў» [9, c. 98]. У 1901 г., праводзячы абследаванні ў басейне р. Заходні Буг, М. Ф. Беляшэўскі сабраў розначасовыя матэрыялы ва ўрочышчах Розумля, Субутын, Міжазер'е каля в. Страдзеч (Брэсцкі р-н, Брэсцкая вобл.) [11, c. 689–690]. У 1908 г. Е. Р. Раманаў падчас разведак па р. Друць выявіў багатую стаянку каменнага веку каля в. Новы Быхаў (Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл.)[2]. У калекцыях усіх прадстаўленых помнікаў у далейшым былі ідэнтыфікаваны матэрыялы КДК.

У 1895 г. была выдадзена карта Гродзенскай губерні В. Ф. Пакроўскага, куды ў тым ліку трапілі і помнікі каменнага веку, на некаторых з іх у далейшым былі ідэнтыфікаваны матэрыялы КДК [12]. Праца, зробленая В. Ф. Пакроўскім, з'яўляецца адной з першых спроб абагульнення раней вядомай інфармацыі аб археалагічных помніках з выкарыстаннем картаграфічных метадаў. Матэрыялы да стварэння археалагічнай карты Магілёўскай губерні збіраліся таксама Е. Р. Раманавым. Сярод пералічаных ім помнікаў каменнага веку прысутнічаюць у тым ліку стаянкі з матэрыяламі КДК. На жаль, праца не зазнала своечасовай публікацыі і на доўгі час заставалася ў архіўных сховішчах, пакуль у 1970-я гг. не была выяўлена Г. А. Каханоўскім і ўведзена ў навуковы ўжытак у пачатку 2000-х гг. І. А. Марзалюком [13]. У далейшым, пасля Е. Р. Раманава, працы па пошуку новых помнікаў і матэрыялаў былі прыпынены падзеямі Першай сусветнай вайны.

Новы этап, звязаны з пачаткам вывучэння мезаліту як асобнай стадыі ў развіцці чалавецтва, распачаўся ў сярэдзіне 1920-х гг. і быў звязаны з шырокімі археалагічнымі працамі, што разгарнуліся ў гэты час. Археалагічныя даследаванні, якія праводзілі К. М. Палікарповіч, А. Д. Каваленя, С. С. Шутаў, І. А. Сербаў, А. М. Ляўданскі на ўсходзе Беларусі, а Л. і І. Савіцкія, К. Пшэмыскі, Я. Карашэўскі і іншыя навукоўцы – на захадзе краіны, сталі асновай для вылучэння КДК як асобнай таксанамічнай адзінкі на пазнейшых этапах [14–20].

У гэты ж час з'яўляюцца і першыя спробы навуковай інтэрпрэтацыі назапашаных матэрыялаў. У абагульняючых артыкулах, прысвечаных культурна-храналагічнаму падзелу каменнага веку Усходняй Беларусі і суседніх рэгіёнаў, К. М. Палікарповіч вылучыў тры археалагічныя культуры: эпіпалеалітычную, тардэнуа, кампіны [16, c. 220]. Асаблівую цікавасць уяўляюць вылучаныя даследчыкам помнікі тардэнуазскай культуры. Яны характарызаваліся значнай сту-

[1] Калекцыя захоўваецца ў фондах Археалагічнага музея ў Кракаве (шыфр МАК/1785, 1925, 3049).

[2] Романов, Е. Р. Археологический очерк Гомельского уезда / Е. Р. Романов // Записки Северо-Западного отделения Русского географического общества. – Вильно, 1910. – Кн. I. – С. 97–128.

пенню мікралітызацыі крамянёвага інвентару і вызначаліся «прысутнасцю трапецыяпадобных формаў наканечнікаў стрэл і невялікіх вастрыёў у выглядзе пласткоў з абабітым краем» [16, с. 220]. На думку К. М. Палікарповіча, помнікі гэтай культуры былі распаўсюджаны ў басейне рэк Прыпяць, Сож і Днепр. Прыкладна ў той самы час стаянкі з падобнымі рысамі крамянёвага інвентару былі вылучаны і ў заходняй частцы Беларусі [21]. У далейшым развіццё даследаванняў помнікаў КДК было прыпынена падзеямі Другой сусветнай вайны і неабходнасцю пасляваеннага аднаўлення.

У 1957 г. з друку выходзіць артыкул К. М. Палікарповіча, прысвечаны стаянкам, абследаваным у сярэднім цячэнні р. Сож [17]. Грунтуючыся на выніках разведак 1928 г., даследчык уводзіць у навуковы ўжытак раней невядомыя калекцыі матэрыялаў, дзе сярод іншых былі прадстаўлены і мікраліты КДК. Дадзенай публікацыяй К. М. Палікарповіч падвёў вынік шматгадовым працам у басейне р. Сож, што дазволіла закласці падмурак для далейшага вывучэння помнікаў эпохі мезаліту ў рэгіёне.

Наступны этап у вывучэнні помнікаў КДК пачынаецца ў пачатку 1960-х гг. і звязаны з пасляваенным пакаленнем беларускіх археолагаў. У гэты час адбываецца пераасэнсаванне матэрыялаў калекцый, назапашаных у перадваенны час, а таксама пачынаюцца новыя шырокамаштабныя працы па даследаванні помнікаў каменнага веку на тэрыторыі Беларусі.

У 1966 г. І. М. Ціханенкаў увёў у навуковы ўжытак крамянёвыя матэрыялы, сабраныя К. М. Палікарповічам ва ўрочышчы Латкі каля в. Рудня Споніцкая (Веткаўскі р-н, Гомельская вобл.) [22]. Даследчык аднёс матэрыялы стаянкі, у тым ліку і мікраліты з прытупленым рэтушшу краем, да позняга этапу грэнскай культуры і датаваў іх познім дрыасам [22, с. 256–261]. У. Ф. Ісаенка ў артыкуле 1966 г., падсумоўваючы вынікі даследаванняў 1961–1965 гг. на тэрыторыі Палесся, уводзіць у навуковы ўжытак матэрыялы новых помнікаў [23]. У далейшым з сабраных калекцый былі вылучаны матэрыялы КДК на помніках Акулінка, Белая Сарока 1, Дарашэвічы, Рожава і шэрагу іншых. У. Ф. Ісаенка прадставіў першасную класіфікацыю геаметрычных мікралітаў, якая ўключала мікрапласцінкі з прытупленым краем і скошаным канцом, адшчэпы з прытупленым краем тыпу Кудлаеўкі, падоўжаныя сегментападобныя прылады, шырокія сегментападобныя прылады, паўсегменты, сегменты з падпрацаванай верхавінай, шырокія трохвугольнікі, шырокія, нізкія, раўнабедраныя і прамавугольныя трапецыі [23, с. 29]. Пры гэтым У. Ф. Ісаенка засяродзіў увагу толькі на пералічэнні тыпаў, не раскрываючы сутнасць кожнага з іх, што моцна ўскладніла ўспрыманне дадзенай тыпалогіі. Найбольш верагодна, што менавіта таму яна не была прынята археолагамі. Гэта было паўторана і ў наступных публікацыях даследчыка, прысвечаных тыпалогіі крамянёвых вырабаў з тэрыторыі Паўднёвай Беларусі [24]. Між тым у сваіх працах У. Ф. Ісаенка ўпершыню звярнуў увагу на тапаграфію размяшчэння і стратыграфічныя асаблівасці залягання мезалітычных помнікаў на тэрыторыі Беларускага Палесся [23, с. 25–26].

У другой палове 1960-х гг. У. Ф. Ісаенка вылучыў на тэрыторыі Беларусі тры культурна-гістарычныя вобласці: макралітычную (Верхняе Падняпроўе), мікра-макралітычную (Верхняе Панямонне, верхняя Прыпяць), мікралітычную (Усходняе Палессе) [25–27]. Вылучаныя вобласці характарызаваліся сталай прысутнасцю ў складзе крамянёвага інвентару мікралітаў, якія зараз разглядаюцца ў кантэксце КДК [27, с. 56–64]. Аднак прапанаваны У. Ф. Ісаенкам культурна-храналагічны падзел эпохі мезаліту Беларусі быў падтрыманы не ўсімі даследчыкамі. А. А. Фармозаў адмаўляў існаванне тут «макралітычнага мезаліту» і лічыў яго вылучэнне штучнай з’явай [28, с. 97].

Значны ўплыў на пашырэнне ведаў аб мезалітычных помніках зрабіла выданне археалагічнай карты У. Ф. Ісаенкі (1968). У дадзенай працы была абагульнена інфармацыя аб большасці вядомых на той момант помнікаў эпохі мезаліту на тэрыторыі Беларусі [26]. Сярод прадстаўленых стаянак і асобных месцазнаходжанняў можна вылучыць каля 40 помнікаў, якія ўключалі ў склад крамянёвага інвентару мікраліты КДК. Асобна трэба адзначыць інфармацыю аб чатырох пунктах са знаходкамі касцяных і рагавых артэфактаў, якія зараз атаясамліваюцца з КДК.

Выключна важнае значэнне для вывучэння старажытнасцей КДК на тэрыторыі Беларусі мела публікацыя С. К. Казлоўскага [3]. У артыкуле польскі археолаг сабраў і абагульніў даныя аб усіх вядомых на той час знаходках каморніцкіх мікралітаў на ўсход ад р. Заходні Буг. Даследчык

вылучыў 22 помнікі, якія змяшчалі ў сваіх матэрыялах згаданы тып артэфактаў, з іх 18 паходзіла з паўднёвай часткі Беларусі. Гэты факт дазволіў С. К. Казлоўскаму ўключыць тэрыторыю Беларускага Палесся ў асноўны арэал новай культурнай адзінкі [3, s. 107–120]. Нягледзячы на гэта, у беларускай гістарыяграфіі дадзеная публікацыя працяглы час заставалася незаўважанай, што значна замарудзіла працэс вылучэння матэрыялаў КДК у калекцыях шматкультурных помнікаў.

Значнай падзеяй у даследаванні помнікаў КДК на тэрыторыі Беларусі стала адкрыццё ў 1975 г. А. Г. Калечыц помніка Новыя Грамыкі 10 ва ўрочышчы Аўрамаў Бугор (Веткаўскі р-н, Гомельская вобл.). Помнік быў даследаваны на вялікай плошчы (775 м$^2$), тут былі зафіксаваны сляды двух жытлаў і 24 плямы агнішчаў [29, с. 94–95]. На падставе знойдзеных матэрыялаў навуковец аднесла помнік да пачатку позняга мезаліту [30, с. 20]. У больш позніх працах даследчыца звязвала атрыманыя матэрыялы з сожскай мезалітычнай культурай і вызначыла яго як паселішча-майстэрню [31, с. 65].

Да другой паловы 1980-х гг. у беларускай гістарыяграфіі да КДК адносіліся толькі стаянкі Кажан-Гарадок, Беласарока, Рэчыца 2 і Крынічная [32, с. 124]. Культурную прыналежнасць апошняй аспрэчылі В. Я. Кудрашоў і В. Л. Ліпніцкая, якія звязвалі крамянёвы інвентар помніка з бутаўскай культурай [33]. Нягледзячы на публікацыю згаданых аўтараў, В. П. Ксяндзоў у аўтарэфераце да доктарскай дысертацыі аднёс дадзены помнік да КДК [34, с. 26]. Канчаткова сувязь помніка Крынічная з КДК была абвергнута даследаваннямі А. У. Коласава [35]. Напрыканцы 1980-х гг. адбываецца выяўленне і праводзіцца вывучэнне новых помнікаў з матэрыяламі КДК на тэрыторыі Палесся (Азярное 1, Азярное 2Б, Ліпляны 3). Даследаванне гэтых помнікаў і ўвядзенне іх матэрыялаў у навуковы ўжытак заклалі падмурак для пачатку новага этапу ў гісторыі вывучэння помнікаў КДК на тэрыторыі Беларусі [36; 37].

Чарговы этап у вывучэнні КДК пачаўся з другой паловы 1990-х гг., чаму паспрыяла выяўленне новых помнікаў дадзенай культуры на Беларускім Палессі. Да гэтага часу адносіцца першая спроба комплекснага асвятлення праблематыкі КДК, што была зроблена ў канцы 1990-х гг. В. Я. Кудрашовым. Па яго меркаваннях, на тэрыторыі Беларусі помнікі КДК былі распаўсюджаны ў ніжнім і сярэднім цячэнні р. Прыпяць і ў нізоўях р. Сож [37, с. 76–77]. Да КДК даследчыкам былі аднесены калекцыі крамянёвых вырабаў з помнікаў Азярное 1, Ліпняны 3, Рэчыца 2, Беласарока, Кажан-Гарадок, а таксама частка касцяных вырабаў з возера Вячэра [37, с. 81]. З інтэрпрэтацыяй і аднясеннем матэрыялаў дадзеных помнікаў да КДК пагадзілася А. Г. Калечыц [38, с. 41]. Таксама ў гэты перыяд знаходкі мікралітаў КДК пачынаюць вылучацца сярод змяшаных матэрыялаў больш позніх эпох.

Нягледзячы на тое, што паняцце КДК стала замацавалася ў археалагічнай літаратуры, яе старажытнасці працягвалі ўключацца ў склад іншых археалагічных культур [31, с. 65]. У прыватнасці, У. Ф. Ісаенка працягнуў развіваць свае погляды на развіццё мезалітычных культур на тэрыторыі Беларусі. У межах арэалу мікралітычнай культуры даследчык вылучае больш дробныя культурныя адзінкі (яніславіцкая, кудлаеўская, днепра-прыпяцкая) [39, с. 18].

Значны ўклад у вывучэнне супольнасцей фінальнага палеаліту і мезаліту Заходняй Беларусі быў зроблены В. С. Абухоўскім. Так, ім быў выдадзены каталог матэрыялаў каменнага і бронзавага вякоў з тэрыторыі Беларусі, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве (у тым ліку было ідэнтыфікавана некалькі помнікаў КДК) [19]. З пачатку 2000-х гг. В. С. Абухоўскі працаваў над доктарскай дысертацыяй, прысвечанай фінальнаму палеаліту і мезаліту Заходняй Беларусі. На вялікі жаль, яна так і засталася нясконачанай па прычыне заўчаснай смерці даследчыка. У 2009 г. польскія сябры і калегі В. С. Абухоўскага апублікавалі яго незавершаную дысертацыю з багатым ілюстрацыйным матэрыялам па каменным веку Заходняй Беларусі [20]. У працы на тэрыторыі заходняй часткі Беларусі ў эпоху мезаліту былі вылучаны КДК, кундская, каморніцкая і яніславіцкая культуры, комплексы тыпу Старыя Войкавічы 5, комплексы Нарачанскага тыпу і комплексы з трапецыямі і вастрыямі са скошаным рэтушшу канцом [20, s. 24]. Акрамя гэтага ў публікацыі прадстаўлены падрабязны тыпалагічны ліст для матэрыялаў фінальнага палеаліту і мезаліту [20, s. 13–24]. Аднак па прычыне незавершанасці працы застаецца незразумелым, як прадстаўленая тыпалогія суадносіцца з вылучанымі ім культурамі і комплексамі.

У 1997–2006 гг. праводзіліся раскопкі на помніках Куль 1 (Ляхавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), Старыя Войкавічы 5, Кастрычніцкі (Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), Пышкі 3 (Гродзенскі р-н, Гродзенская вобл.), дзе былі выяўлены прадстаўнічыя матэрыялы КДК [20]. Аднакультурны характар часткі гэтых помнікаў дазволіў выкарыстоўваць іх як апорныя пры вывучэнні старажытнасцей КДК на тэрыторыі Беларусі[1]. У гэты перыяд упершыню для помнікаў КДК былі праведзены комплексныя шматдысцыплінарныя даследаванні, а таксама атрыманы першыя датаванні з выкарыстаннем метаду радыевугляроднага аналізу [40].

У другой палове 2000-х гг. А. У. Коласавым была выказана думка аб сінкрэтычным характары крамянёвых калекцый асобных помнікаў з Беларускага Пасожжа [35]. Іх далейшая культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя дазволіла вылучыць тут матэрыялы шэрагу фінальнапалеалітычных і мезалітычных культур, у тым ліку і КДК. Гэта значна павялічыла крыніцазнаўчую базу, а таксама дало магчымасць пашырыць арэал гэтай культуры на Верхняе Падняпроўе. На тэрыторыі Пасожжа было вылучана пяць помнікаў з выразнымі рысамі КДК: Новыя Грамыкі 10 (Аўрамаў Бугор), Новыя Цярэшкавічы, Прысна, Сапожкі-Бервяно, Раманавічы [35, с. 71]. А. У. Коласаў зрабіў пераатрыбуцыю атрыманай калекцыі з помніка Аўрамаў Бугор і аднёс паселішча да аднаго з апорных помнікаў КДК на тэрыторыі Пасожжа [35]. Таксама ім было выказана меркаванне аб сувязі выяўленых жытлаў з КДК [41, с. 96], што на сённяшні час пастаўлена пад сумненне вынікамі радыевугляроднага датавання[2]. У публікацыі 2016 г. даследчык уключыў у склад КДК ужо 17 помнікаў, размешчаных у басейнах рэк Нёман, Прыпяць і Сож, а таксама вылучыў у асобную групу помнікі каморніцкай культуры (Дабрынёва 1, Селішча Малае 3, Бухліцкі Хутар, Камянюкі 2) [42, с. 70–72].

Развіццё рэгіянальных даследаванняў у апошнія дзесяцігоддзі дазволіла адкрыць вялікую колькасць новых помнікаў і значна пашырыць арэал КДК на тэрыторыі Беларусі. Так, падчас археалагічных прац 2007–2017 гг. на тэрыторыі Белавежскай пушчы былі выяўлены помнікі з прадстаўнічымі матэрыяламі КДК (Вілы 1, 2; Камянюкі 1, 2, 6, 16; Селішча Малае 3). У 2019 г. выйшаў абагульняючы артыкул, прысвечаны мезалітычным матэрыялам, выяўленым у рэгіёне [43]. Новыя матэрыялы былі выяўлены таксама падчас археалагічнага абследавання тэрыторыі Палесся і Перадпалесся. Упершыню матэрыялы КДК былі выяўлены ў вярхоўях р. Друць (Бялынічы 1А) [44].

У гэты ж час робяцца спробы пераасэнсавання і публікацыі калекцый з помнікаў, выяўленых у 1960–1980-я гг. У абагульняючай манаграфіі па мезаліце Беларусі А. Г. Калечыц і А. У. Коласаў адзначылі 70 помнікаў з матэрыяламі КДК на тэрыторыі Беларусі [45].

**Высновы.** Такім чынам, упершыню ў гісторыі вывучэння помнікаў КДК на тэрыторыі Беларусі былі вылучаны чатыры этапы, кожны з якіх характарызуе стан даследаванасці, а таксама адлюстроўвае розныя навуковыя падыходы да вывучаемай праблематыкі.

Першы этап ахоплівае перыяд **ад 1870-х да сярэдзіны 1920-х гг**. У гэты час адбываецца ўзнікненне цікавасці да помнікаў каменнага веку на тэрыторыі Беларусі. Праводзяцца першыя абследаванні помнікаў, на якіх на пазнейшых этапах былі выяўлены матэрыялы КДК (З. Глогер, Е. Р. Раманаў, М. Ф. Беляшэўскі). Таксама на дадзеным этапе адбываецца стварэнне першых археалагічных карт, на якіх адзначаецца прысутнасць помнікаў, што ў далейшым былі аднесены да КДК. Большасць выяўленых у гэты перыяд матэрыялаў не была ўведзена ў навуковы ўжытак.

Другі этап прыпадае на перыяд **ад сярэдзіны 1920-х да пачатку 1960-х гг**. Адбываецца пашырэнне археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі. Пачынаецца суцэльнае абследаванне басейна р. Сож, праводзяцца працы ў басейне р. Днепр і вярхоўях р. Прыпяць ва ўсходняй частцы Беларусі (К. М. Палікарповіч, А. Д. Каваленя, С. С. Шутаў, І. А. Сербаў, А. М. Ляўданскі), праводзяцца значныя разведачныя працы на захадзе Палесся і Панямонні (Л. і І. Савіцкія, К. Пшэмыскі, Я. Карашэўскі і інш.). Да гэтага часу адносіцца адкрыццё помнікаў, матэрыялы якіх складуць аснову для пазнейшага вылучэння КДК. Старажытнасці КДК разам з матэрыяламі іншых культур эпохі мезаліту разглядаліся ў складзе тардэнуазскай культуры.

[1] Вашанаў, А. М. Куль 1 – мезалітычная стаянка ў басейне Шчары / А. М. Вашанаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2017. – Вып. 28. – С. 148–160.

[2] У 2017 г. у рамках выканання гранту БРФФД А. Г. Калечыц было зроблена датаванне па вугалі з жытла № 2 (IGS-1807 955±70 BP), якое сведчыць аб сярэднявечным узросце зафіксаваных жытлаў.

Трэці этап ахоплівае прамежак часу **ад пачатку 1960-х да сярэдзіны 1990-х гг**. У гэты перыяд адбываецца пераасэнсаванне матэрыялаў калекцый, назапашаных у перадваенны час, а таксама пачынаюцца новыя шырокамаштабныя працы па даследаванні помнікаў каменнага веку, у тым ліку і мэтанакіраваны пошук мезалітычных стаянак. Нягледзячы на актыўныя тэарэтычныя распрацоўкі, зробленыя для суседніх рэгіёнаў, беларускія археолагі працягвалі разглядаць помнікі і матэрыялы КДК у складзе ўжо вылучаных імі мезалітычных культур – сожскай, днепра-дзяснінскай, нёманскай (У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц, У. П. Ксяндзоў, В. П. Капыціна і інш.). Напрыканцы этапу адбываецца прыняцце новай таксанамічнай адзінкі беларускай археалагічнай супольнасцю. У склад старажытнасцей КДК былі ўключаны матэрыялы помнікаў Кажан-Гарадок, Беласарока, Рэчыца 2, Азярное 1.

Чацвёрты этап пачаўся **з другой паловы 1990-х гг**. і працягваецца **па сённяшні дзень**. На дадзеным этапе адбываецца адкрыццё новых помнікаў КДК з прадстаўнічымі калекцыямі (Куль 1, Пышкі 3, Старыя Войкавічы 5, Кастрычніцкі і інш.). Працягваюцца працэсы пераасэнсавання і ўвядзенне ў навуковы ўжытак калекцый помнікаў, што былі выяўлены на папярэдніх этапах. Адбываецца выданне першых абагульняючых публікацый, прысвечаных КДК. Робяцца датаванні матэрыялаў з помнікаў КДК пры дапамозе прыродазнаўчых метадаў. Развіццё даследаванняў паспрыяла распрацоўцы пытанняў, звязаных з арэалам, храналогіяй, тэхналогіяй крэмнеапрацоўкі, тыпалагічным складам крамянёвага і касцянога інвентару (В. Я. Кудрашоў, В. С. Абухоўскі, А. У. Коласаў, А. М. Вашанаў і інш.).

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu (cz. 3). Kultura Komornicka na tle mezolitu Europy Środkowej / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1967. – T. 28. – S. 5–32.

2. Sawicki, L. Przyczynek do znajomości z prechistorii Polesia / L. Sawicki // Żiemia. – 1925. – № 6–8. – S. 136–148.

3. Kozłowski, S. K. Zespoły typu kudłajewka / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1972. – T. 33. – S. 107–120.

4. Залізняк, Л. Л. Мезолітичні пам’ятни типу Таценкі-Кудлаївка / Л. Л. Залізняк // Археологія. – 1976. – № 20. – С. 60–66.

5. Зализняк, Л. Л. Мезолит Юго-Восточного Полесья / Л. Л. Зализняк. – Киев: Наук. думка, 1984. – 120 с.

6. Kozłowski, S. K. Mesolithic in Poland. A new approach / S. K. Kozłowski. – Warszawa: Wydaw. Uniw. Warszawskiego, 1989. – 246 s.

7. Głoger, Z. Osady nad Niemnem i na Podlasiu z czasów użytku krzemienia / Z. Głoger // Wiadomości Archeologiczne. – 1873. – T. 1. – S. 97–124.

8. Беляшевский, Н. Ф. Несколько новых стоянок каменного века по Днепру и его притокам / Н. Ф. Беляшевский // Киевская старина. – 1891. – Т. 32. – С. 443–444.

9. Романов, Е. Р. Старина доисторическая Северо-Западного края / Е. Р. Романов // Виленский календарь на 1908 г. – Вильно, 1908. – С. 5–110.

10. Dziedzić, A. Around Zygmunt Gloger collection. Epi-Paleolithic artefacts from Belarus stored in the Archeological Museum in Kraków / A. Dziedzić, D. Stefański // Crossing the borders. Interregional and cross-cultural interactions in the context of lithic studies: abstr. book [of the] 15th SKAM Lithic Workshop, 17–19 Oct. 2018, Minsk, Belarus / Inst. of History of the Nat. Acad. of Sciences of Belarus [et al.]; ed.: V. Asheichyk [et al.]. – Minsk, 2018. – P. 50–51.

11. Беляшевский, Н. Ф. Дюнные стоянки неолитической эпохи на берегах реки Зап. Буга в его среднем течении / Н. Ф. Беляшевский // Труды XI археологического съезда в Киеве 1899 г. / под ред. графини Уваровой, С. С. Слуцкого. – М., 1901. – Т. 1. – С. 673–713.

12. Покровский, Ф. Д. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф. Д. Покровский. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1895. – 165 с.

13. Раманаў, Е. Р. З гісторыка-археалагічнай спадчыны: выбр. тв. / Е. Р. Раманаў. – Магілёў: Магілёўс. дзярж. ун-т, 2006. – 238 с.

14. Палікарповіч, К. М. Дагістарычныя стаянкі сярэдняга і ніжняга Сажа (па досьледах 1926 г.) / К. М. Палікарповіч // Працы кафедры археалогіі / Ін-т беларус. культуры. – Мінск, 1928. – Т. 1. – С. 123–252. – (Запіскі Аддзела гуманітарных навук; кн. 5)

15. Палікарповіч, К. М. Дагістарычныя стаянкі сярэдняга Сажа. Матар’ялы абсьледваньня 1927 г. / К. М. Палікарповіч // Працы Археалагічнай камісіі / Беларус. акад. навук, Аддз. гуманітар. навук. – Мінск, 1930. – Т. 2. – С. 383–478. – (Запіскі Аддзела гуманітарных навук; кн. 11).

16. Палікарповіч, К. М. Досьледы культур каменнага і бронзавага перыодаў у БССР у 1930–1931 гг. / К. М. Палікарповіч // Працы секцыі археалогіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 227–230.

17. Поликарпович, К. М. Стоянки среднего Посожья / К. М. Поликарпович // Материалы по археологии БССР / Ин-т археологии АН БССР. – Минск, 1957. – Т. 1. – С. 45–148.

18. Sawicka, I. Badania archeologiczne na Polesiu / I. Sawicka // Z Otchłani Wieków: pismo poświęcone pradziejom Polski. – 1927. – T. 2, № 4. – S. 60–61.

19. Obuchowski, W. Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / W. Obuchowski. – Warszawa: Państ. Muzeum Archeologiczne, 2003. – 207 s.

20. Obuchowski, W. Materiały paleolityczne i mezolityczne z Zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. – Warszawa: Uniw. Warszawski, 2009. – 296 s.

21. Антоневич, В. Древнейшие остатки человека в Северо-Восточной Польше и Литве / В. Антоневич // Труды II Международной конференции ассоциации по изучению четвертичного периода Европы / Всесоюз. геол.-развед. об-ние. – Л.; М., 1934. – Вып. 5. – С. 28–44.

22. Тихоненков, И. М. Кремневый инвентарь стоянки Латки / И. М. Тихоненков // Вопросы истории и археологии: материалы X конф. молодых ученых по обществ. наукам, июнь, 1966 г. / Акад. наук БССР, Отд-ние обществ. наук; под общ. ред. Т. С. Горбунова. – Минск, 1966. – С. 256–261.

23. Исаенко, В. Ф. Мезолит и неолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко // Древности Белоруссии: материалы конф. по археологии Белоруссии и смеж. территорий / Акад. наук БССР, Ин-т истории; под ред. В. Ф. Исаенко, А. Г. Митрофанова, Г. В. Штыхова. – Минск, 1966. – С. 22–53.

24. Исаенко, В. Ф. Основные типы кремневых орудий Южной Белоруссии / В. Ф. Исаенко // Орудия каменного века: [докл. конф.] / АН УССР, Ин-т археологии; редкол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – Киев, 1978. – С. 70–89.

25. Исаенко, В. Ф. Мезолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко // Вопросы истории и археологии: материалы X конф. молодых ученых по обществ. наукам, июнь, 1966 г. / Акад. наук БССР, Отд-ние обществ. наук; под общ. ред. Т. С. Горбунова. – Минск, 1966. – С. 328–339.

26. Исаенко, В. Ф. Археологическая карта Белоруссии: [в 3 вып.] / В. Ф. Исаенко; под ред. В. Д. Будько, Ф. В. Борисевича. – Минск: Полымя, 1968–1976. – Вып. 1: Памятники каменного века. – 1968. – 126 с.

27. Исаенко, В. Ф. Мезолит / В. Ф. Исаенко // Очерки по археологии Беларуси: [в 2 ч.] / Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск, 1970. – Ч. 1. – С. 49–66.

28. Формозов, А. А. Проблемы этнокультурной истории каменного века на территории Европейской части СССР / А. А. Формозов. – М.: Наука, 1977. – 143 с.

29. Калечиц, Е. Г. Об изучении жилищ каменного века в Посожье / Е. Г. Калечиц // Полевая археология мезолита-неолита: сб. науч. тр. / АН СССР, Ленингр. отд-ние Ин-та археологии. – Л., 1990. – С. 93–101.

30. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е. Г. Калечиц; науч. ред. Д. Я. Телегин. – Минск: Наука и техника, 1987. – 158 с.

31. Капыцін, В. Ф. Сожская культура / В. Ф. Капыцін, А. Г. Калечыц // Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 1: Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц [і інш.]. – С. 55–67.

32. Ксензов, В. П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / В. П. Ксензов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 134 с.

33. Кудряшов, В. Е. К вопросу о кудлаевской культуре эпохи мезолита на Могилёвщине / В. Е. Кудряшов, О. Л. Липницкая // Дняпроўскі край: паведамл. абл. краязн. канф., 23 крас. 1992 г. / Магілёўс. абл. краязн. музей; адк. рэд. С. І. Бяспанскі. – Магілёў, 1993. – С. 27–29.

34. Ксензов, В. П. Мезолитические культуры Белорусского Подвинья и Поднепровья: автореф. дис. … д-ра ист. наук: 07.00.06 / Ксензов Владимир Павлович; Ин-т истории АН Беларуси. – Минск, 1994. – 33 с.

35. Колосов, А. В. Мезолит Белорусского Посожья: (культурно-хронологическая интерпретация материалов): дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / Колосов Александр Владимирович. – Минск, 2006. – 105 л.

36. Кудряшов, В. Е. Озерное-1 – новый памятник кудлаевской культуры эпохи мезолита в Белорусском Полесье / В. Е. Кудряшов, Н. Н. Кривальцевич // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі Акад. навук Беларусі. – Мінск, 1994. – № 5. – С. 87–102.

37. Кудрашоў, В. Я. Кудлаеўская культура / В. Я. Кудрашоў // Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 1: Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц [і інш.]. – С. 67–76.

38. Калечыц, А. Г. Старажытная Янаўшчына / А. Г. Калечыц. – Мінск: Брэсц. друк., 2001. – 106 с.

39. Ісаенка, У. Ф. Каменны век. Пераход ад праабшчыны да роду / У. Ф. Ісаенка // Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – С. 10–29.

40. Мезалітычны помнік культуры Беларусі – Старыя Войкавічы / Я. К. Яловічава, В. С. Абухоўскі, Н. В. Скапцова [і інш.] // Праблемы палеагеаграфіі позняга плейстацэну і галацэну: тэз. дакл. беларус.-пол. семінара, Гродна, 26–29 верас. 2000 г. / Ін-т геал. навук НАН Беларусі. – Гродна, 2000. – С. 103–105.

41. Колосов, А. В. Древности кудлаевской культуры эпохи мезолита Верхнего Поднепровья / А. В. Колосов // Романовские чтения-2: сб. тр. Междунар. науч. конф., Могилев, 10–11 нояб. 2005 г. / Могилев. гос. ун-т; под ред. О. В. Дьяченко. – Могилев, 2006. – С. 74–76.

42. Колосов, А. В. Каменный век Беларуси: пособие для студентов / А. В. Колосов. – Могилев: Могилев. гос. ун-т, 2016. – 112 с.

43. Ткачоў, А. Ю. Мезаліт басейна р. Лясная правая / А. Ю. Ткачоў, А. М. Вашанаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі: зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Ин-т гісторыі. – Мінск, 2017. – Вып. 28: Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі (памяці Таццяны Мікалаеўны Каробушкінай). – С. 161–172.

44. Вашанаў, А. М. Археалагічныя даследаванні ў Вярхоўях ракі Друць у 2009–2012 гг.: матэрыялы да археалагічнай карты Бялыніцкага раёна / А. М. Вашанаў // Гісторыя Друцка-Бярэзінскага краю: матэрыялы Першых грамад. навук.-краязн. чытанняў (Мінск–Крупкі–Магілёў, 28 сак., 17 траўня, 20 чэрв. 2015 г. / рэдкал.: В. У. Арцюховіч [і інш.]; уклад. А. П. Аляхновіч. – Мінск, 2015. – С. 11–20.

45. Калечыц, А. Г. Мезалітычныя помнікі Беларусі / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў. – Мінск: Беларус. навука, 2021. – 369 с.

## References


1. Kozłowski S. K. Z problematyki polskiego mezolitu (cz. 3). Kultura Komornicka na tle mezolitu Europy Środkowej. *Światowit*, 1967, vol. 28, pp. 5–32 (in Polish).

2. Sawicki L. Przyczynek do znajomości z prechistorii Polesia. *Żiemia* [Earth], 1925, no. 6–8, pp. 136–148 (in Polish).

3. Kozłowski S. K. Zespoły typu kudłajewka. *Światowit*, 1972, vol. 33, pp. 107–120 (in Polish).

4. Zaliznyak L. L. Mesolithic sites of the Tatsenki-Kudlaivka type. *Arkheologiya* [Archeology], 1976, no. 20, pp. 60–66 (in Ukrainian).

5. Zaliznyak L. L. *The mesolithic of Southeastern Polesia*. Kyiv, Naukova dumka Publ., 1984. 120 p. (in Russian).

6. Kozłowski S. K. *Mesolithic in Poland. A new approach.* Warsaw, University of Warsaw Publishing House, 1989. 246 p.

7. Głoger Z. Osady nad Niemnem i na Podlasiu z czasów użytku krzemienia. *Wiadomości Archeologiczne* [Archaeological News], 1873, vol. 1, pp. 97–124 (in Polish).

8. Belyashevskii N. F. Several new Stone Age sites along the Dnieper and its tributaries. *Kievskaya starina* [Kyiv Antiquity], 1891, vol. 32, pp. 443–444 (in Russian).

9. Romanov E. R. Prehistoric antiquities of the Northwestern region. *Vilenski calendar for 1908*. Vilnia, 1908, pp. 5–110 (in Russian).

10. Dziedzić A. Around Zygmunt Gloger collection. Epi-Paleolithic artefacts from Belarus stored in the Archaeological Museum in Kraków. *Crossing the borders. Interregional and cross-cultural interactions in the context of lithic studies: abstract book [of the] 15th SKAM Lithic Workshop, 17–19 October 2018, Minsk, Belarus*. Minsk, 2018, pp. 50–51 (in English).

11. Belyashevskii N. F. Dune settlements of the neolithic era on the banks of the Western Bug river in its middle course. *Trudy XI arkheologicheskogo s"ezda v Kieve 1899 g.* [Proceedings of the 11th Archaeological congress in Kyiv 1899]. Moscow, 1901, vol. 1, pp. 673–713 (in Russian).

12. Pokrovskii F. D. *Archaeological map of the Grodno province.* Vilna, A. G. Syrkin Publ., 1895. 165 p. (in Russian).

13. Ramanau E. R. *From the historical and archaeological heritage: selected works*. Mogilev, Mogilev State University, 2006. 238 p. (in Belarusian).

14. Polikarpovich K. M. Prehistoric sites of the middle and lower Sozh river (based on the 1926 investigations). *Works of the Department of Archaeology*. Minsk, 1928, vol. 1, pp. 123–252 (in Belarusian).

15. Polikarpovich K. M. Prehistoric sites of the middle Sozh river. Materials from the 1927 survey. *Proceedings of the Archaeological Commission*. Minsk, 1930, vol. 2, pp. 383–478 (in Belarusian).

16. Polikarpovich K. M. Investigations of Stone and Bronze Age cultures in the BSSR in 1930–1931. *Works of the Archaeology Section*. Minsk, 1932, vol. 3, pp. 227–230 (in Belarusian).

17. Polikarpovich K. M. Sites of the middle Sozh region. *Materials on the archaeology of Belaru*s. Minsk, 1957, vol. 1, pp. 45–148 (in Russian).

18. Sawicka I. Badania archeologiczne na Polesiu. *Z Otchłani Wieków: pismo poświęcone pradziejom Polski* [From the Depths of the Ages: A Journal Devoted to the Prehistory of Poland], 1927, vol. 2, no. 4, pp. 60–61 (in Polish).

19. Obuchowski W. *Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawa* [Flint and Stone Artifacts from the Paleolithic to the Early Iron Age from the Territories of Belarus in the Collections of the State Archaeological Museum in Warsaw]. Warsaw, State Archaeological Museum, 2003. 207 p. (in Polish).

20. Obuchowski W. *Materiały paleolityczne i mezolityczne z Zachodniej Białorusi* [Paleolithic and Mesolithic Materials from Western Belarus]. Warsaw, University of Warsaw, 2009. 296 p. (in Polish).

21. Antonevich V. The oldest human remains in Northeastern Poland and Lithuania. *Trudy II Mezhdunarodnoi konferentsii assotsiatsii po izucheniyu chetvertichnogo perioda Evropy* [Proceedings of the 2nd International Conference of the Association for the Study of the Quaternary Period in Europe]. Leningrad, Mosow, 1934, iss. 5, pp. 28–44 (in Russian).

22. Tikhonenkov I. M. Flint inventory of the Latki Site. *Voprosy istorii i arkheologii: materialy X konferentsii molodykh uchenykh po obshchestvennym naukam, iyun', 1966 г.* [Issues of history and archaeology: materials of the 10th conference of young scientists in social sciences, June 1966]. Minsk, 1966, pp. 256–261 (in Russian).

23. Isaenko V. F. Mesolithic and Neolithic of the Pripyat Polesia. *Drevnosti Belorussii: materialy konferentsii po arkheologii Belorussii i smezhnykh territorii* [Antiquities of Belarus: materials of the conference on the archaeology of Belarus and adjacent territories]. Minsk, 1966, pp. 22–53 (in Russian).

24. Isaenko V. F. *Main types of flint tools in Southern Belarus. Orudiya kamennogo veka: doklady konferentsii* [Stone Age tools: conference reports]. Kyiv, 1978, pp. 70–89 (in Russian).

25. Isaenko V. F. Mesolithic of the Pripyat Polesia. *Voprosy istorii i arkheologii: materialy X konferentsii molodykh uchenykh po obshchestvennym naukam, iyun', 1966 g.* [Issues of history and archaeology: materials of the 10th conference of young scientists in social sciences, June 1966]. Minsk, 1966, pp. 328–339 (in Russian).

26. Isaenko V. F. *Archaeological map of Belarus. Issue 1. Stone Age sites.* Minsk, Polymya Publ., 1968. 126 p. (in Russian).

27. Isaenko V. F. Mesolithic. *Essays on the archaeology of Belarus. Part I.* Minsk, 1970, pp. 49–66 (in Russian).

28. Formozov A. A. *Problems of the ethnocultural history of the stone age in the European part of the USSR*. Moscow, Nauka Publ., 1977. 143 p. (in Russian).

29. Kalechits E. G. On the study of Stone Age dwellings in the Sozh Region. *Polevaya arkheologiya mezolita-neolita: sbornik nauchnykh trudov* [Field archaeology of the Mesolithic-Neolithic: collection of scientific works]. Leningrad, 1990, pp. 93–101 (in Russian).

30. Kalechits E. G. *Stone and Bronze Age sites of Eastern Belarus*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1987. 158 p. (in Russian).

31. Kapytsin V. F., Kalechyts A. G. Sozh culture. *Archaeology of Belarus. Vol. 1. Stone and Bronze Ages*. Minsk, 1997, pp. 55–67 (in Russian).

32. Ksenzov V. P. *Paleolithic and mesolithic of the Belarusian Dnieper Region*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1988. 134 p. (in Russian).

33. Kudryashov V. E., Lipniskaya O. L. On the question of the Kudlaevskaya culture of the mesolithic era in the Mogilev region. *Dnyaprouski krai: pavedamlenni ablasnoi krayaznauchai kanferentsyi, 23 krasavika 1992 g.* [Dnieper region: proceedings of the regional local history conference, April 23, 1992]. Mogilev, 1993, pp. 27–29 (in Russian).

34. Ksenzov V. P. *Mesolithic cultures of the Belarusian Dvina and Dnieper Regions*. Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1994. 33 p. (in Russian).

35. Kolosov A. V. *Mesolithic of the Belarusian Sozh Region (cultural-chronological interpretation of materials*. Ph.D. Thesis. Minsk, 2006. 105 p. (in Russian).

36. Kudryashov V. E., Krival'tsevich N. N. Ozerne-1 – a new site of the Kudlaevskaya culture of the mesolithic era in the Belarusian Polesia. *Gistarychna-arkhealagichny zbornik* [Historical and archaeological collection]. Minsk, 1994, no. 5, pp. 87–102 (in Russian).

37. Kudrashou V. Y. Kudlaevskaya culture. *Archaeology of Belarus. Vol. 1. Stone and Bronze Ages*. Minsk, 1997, pp. 67–76 (in Belarusian).

38. Kalechyts A. G. *Ancient Yanaushchyna*. Minsk, Brest Printing House, 2001. 106 p. (in Belarusian).

39. Isaenka U. F. Stone Age. Transition from primitive community to clan. *Essays on the history of Belarus. Part 1.* Minsk, 1994, pp. 10–29 (in Belarusian).

40. Yalovichava Ya. K., Abukhouski V. S., Skaptsova N. V., Mikhailau M. D., Luchyna G. I. Mesolithic site of Belarus – Staryya Voykavichy. *Prablemy paleageagrafii poznyaga pleistatsenu i galatsenu: tezisy dakladau belaruska-pol'skaga seminara, Grodna, 26–29 verasnya 2000 g.* [Problems of paleogeography of the late pleistocene and holocene: materials of the Belarusian-Polish seminar, September 26–29, 2000]. Grodno, 2000, pp. 103–105 (in Belarusian).

41. Kolosov A. V. Antiquities of the Kudlaevskaya culture of the mesolithic era in the age. *Romanovskie chteniya-2: sbornik trudov Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii, Mogilev, 10–11 noyabrya 2005 g.* [Romanov readings-2: proceedings of the international scientific conference, Mogilev, November 10–11, 2005]. Mogilev, 2006, pp. 74–76 (in Russian).

42. Kolosov A. V. *Stone Age of Belarus*. Mogilev, Mogilev State University, 2016. 112 p. (in Russian).

43. Tkachou A. Y., Vashanau A. M. Mesolithic of the Lesnaya Pravaya river basin. *Materyyaly pa arkhealogii Belarusi: zbornik navukovykh artykulau. Vyp. 28. Vyniki dasledavannyau pershabytnykh i syarednevyakovykh starazhytnastsei Belarusi (pamyatsi Tatstsyany Mikalaeuny Karobushkinai) = Materials on the Archaeology of Belarus. Iss. 28. Results of investigations of the pre-historic and medieval antiquities of Belarus (in remembrance of Tatyana Karobushkina).* Minsk, 2017, pp. 161–172 (in Belarusian).

44. Vashanau A. M. Archaeological Research in the Upper Reaches of the Drut River in 2009–2012. *Gistoryya Drutska-Byarezinskaga krayu: materyyaly Pershykh gramadskikh navukova-krayaznauchykh chytannyau (Minsk–Krupki–Magileu, 28 sakavika, 17 traunya, 20 chervenya 2015 g.* [History of the Drut-Berezina Region: proceedings of the first public scientific and local history readings (Minsk–Krupki–Mogilev, March 28, May 17, June 20, 2015]. Minsk, 2015. pp. 11–20 (in Belarusian).

45. Kalechyts A. G., Kolasau A. U. *Mesolithic sites of Belarus*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2021. 369 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Вашанов Александр Николаевич** – научный сотрудник отдела археологии первобытного общества. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: vashanau@gmail.com

## Information about the author

**Aliaksandr M. Vashanau** – Scientific Researcher, Department of archeology of prehistoric society. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: vashanau@gmail.com